ке производства содержания городскому и сельскому духовенству // Там жа. – Т. 25-2. – С. 34.

22. О штатах для причтов сельских церквей в епархиях Литовской, Могилёвской, Минской и Полоцкой и в двух уездах Волынской: именной указ 4.04.1842 г., данный Синоду // ПСЗ-2. – Т. 17-1. – № 15470. – С. 264.

23. Римский, С. В. Российская церковь в эпоху великих реформ (церковные реформы в России 1860–1870-х гг.) / С. В. Римский. – М. : Крутицкое патриаршее подворье, 1999. – 568 с.

24. Руководственные для православного духовенства Указы Святейшего Правительствующего Синода 1721–1878 гг. – М. : Тип. М. Н. Лаврова и К, 1879. – [III], 504 с.

25. Шевкун, П. В. Империя и церковь: российская политика в отношении православия на территории Беларуси (1796–1855 гг.) : монография / П. В. Шевкун. – Витебск : ВГМУ, 2015. – 202 с.

## УКЛАД ПРАВАСЛАЎНЫХ СВЯТАРОЎ У АРХЕАЛАГІЧНУЮ НАВУКУ БЕЛАРУСІ (XIX – ПАЧАТАК XX СТСТ.)

*Л. У. Дучыц, В. У. Мядзведзева*
*(Мінск, Беларусь)*

Многія святары хрысціянскіх канфесій, асабліва праваслаўныя, у XIX – пачатку XX ст. актыўна цікавіліся старажытнасцямі на тэрыторыі Беларусі, збіралі фальклор, запісвалі легенды і паданні пра гарадзішчы і курганы, а некаторыя атрымлівалі «Дазвол» ад Імператарскай Археалагічнай камісіі і самі праводзілі раскопкі. Шмат імёнаў святароў сярод аўтараў археалагічных, гістарычных, этнаграфічных і краязнаўчых артыкулаў не толькі ў правінцыйных выданнях, але і ў цэнтральных навуковых часопісах і зборніках. У працы ўсіх 15-ці Імператарскіх Археалагічных з'ездаў Расійскай імперыі

актыўны ўдзел прымалі і святары. [16, с. 79–84; 17, с. 39–48; 44].

Адным з першых вядомых нам святароў, чыя дзейнасць была звязана з даследаваннем старажытнасцей на тэрыторыі Беларусі, з’яўляецца святар Ігнацій Кульчынскі (1707–1747). З 1727 г. па 1735 г. ён навучаўся ў г. Рыме, потым нейкі час жыў пры Сафійскім саборы ў г. Полацку, дзе падрабязна апісаў крыж Еўфрасінні Полацкай. Затым І. Кульчынскі быў прызначаны архімандрытам Каложскага манастыра ў г. Гродна. Даследчык дэталёва апісаў Каложскую царкву і датаваў яе XII ст. і першым у археалагічнай практыцы выкарыстаў цагляную кладку як датуючы матэрыял. Даследаваў ён таксама старажытнасці Гродна і Жыровіцаў. [1, с. 100–105; 49, s. 138–139].

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. архімандрыт Бельчыцкага манастыра каля г. Полацка Іойль (Ізоіаш) Шулакевіч праводзіў раскопкі на тэрыторыі манастыра і выявіў рэшткі падмурка старажытнага храма. Ён таксама вывучаў камяні з надпісамі каля в. Бяздзедавічы ў ваколіцах г. Полацка. [2, с. 26–27].

У першай палове XIX ст. займаўся даследаваннямі ў галіне славянскіх старажытнасцей і распрацоўваў курсы біблейскай археалогіі доктар тэалогіі Міхаіл Кірылавіч Баброўскі (1785–1848) (фота 1). Ён скончыў Духоўную семінарыю пры Віленскім універсітэце (1812). Пасля чаго быў канонікам брэсцкім, затым прафесарам біблейскай археалогіі багаслоўскага факультэта Віленскага ўніверсітэта, з 1833 г. – святар у мястэчку Шарашова, з 1841 – благачынны ў г. Пружаны Гродзенскай губерні. [4; 38, с. 95–103].

Святар Галошаўскай царквы (цяпер в. Галошава ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл.) Леў Ганкевіч у 1830 г. пад уплывам легенд вырашыў, што каля Рагвалодавага каменя, які знаходзіўся ў ваколіцах вёскі, сапраўды могуць быць святыні ці мошчы. Ён дабіўся ў царкоўнага кіраўніцтва дазволу на раскопкі вакол каменя. Разам з дз’яканам і царкоўным старастам яны адслужылі малебен, разабралі частку падлогі ў Барыса-Глебскай царкве і пачалі капаць.

Але раптам пачалася навальніца і працу прыйшлося скончыць. [15, с. 213–217].

Захаваліся звесткі аб тым, што ў сярэдзіне XIX ст. у в. Гошчава (зараз на тэрыторыі Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.) мясцовы святар Лангін Фармасевіч праводзіў раскопкі курганоў («шведскіх магіл») [43, с. 24–33].

У сярэдзіне XIX ст. прыхадскія святары былі своеасаблівым саслоўем гісторыкаў. Менавіта яны вялі прыхадскія летапісы і загадвалі царкоўнымі архівамі, добра арыентаваліся ў мінулым. Таму што, жывучы сярод сваіх прыхажан, святары назіралі мясцовыя побыт і звычаі, а потым іх занатоўвалі. Многія святары друкавалі інфармацыю пра мясцовыя старажытнасці ў губернскай прэсе. Напрыклад, святар К. С-цвъ у 1868 г. апісваў камень-следавік каля мястэчка Рудабелка (цяпер г. п. Акцябрскі Гомельскай вобл.), а пра старажытнасці Браслаўшчыны пісаў святар Анзельм Лячыцкі. [3, с. 134–138; 22, с. 139–143; 31, с. 99; 42].

Святар Мікалай Салаўевіч з мястэчка Пясочнае Капыльскага р-на у 1869 г. у часопісе «Минскія Епархиальныя вѣдомости» надрукаваў вытрымкі з летапісу Песачанскай Пакроўскай царквы. Ён расказваў, што калі у 1866 г. людзі расчышчалі частку лесу пад запашку, то знайшлі каменныя сякеры, малаткі і розныя іншыя рэчы, якія разабралі па хатах. На наступны год М. Салаўевіч даведаўся пра гэта і стаў збіраць тыя рэчы. Потым ён пісаў, што мяркуе перадаць іх у Віленскі Археалагічны музей, а сам факт такіх знаходак занёс у царкоўны летапіс [41, с. 263–270].

Значны ўклад у археалогію ўнеслі святары у канцы XIX ст. Анкеты, якія рассылала Імператарская Археалагічная камісія і іншыя дзяржаўныя ўстановы з мэтай выяўлення помнікаў старажытнасцей, найчасцей запаўнялі менавіта праваслаўныя мясцовыя святары. Яны аказвалі вялікую дапамогу Віленскаму аддзяленню Маскоўскага папярэдняга камітэта па арганізацыі ў г. Вільні IX Археалагічнага з’езда

ў 1893 г. Святары актыўна дасылалі звесткі пра помнікі археалогіі, і, дзякуючы гэтаму, захавальнік Віленскага музея старажытнасцей Ф. В. Пакроўскі склаў археалагічныя карты некалькіх губерній. Так, святар з в. Шарыпы Горацкага павета Магілёўскай губерні Матвей Гінко прыслаў звесткі пра гарадзішча над р. Пнеўкай і запісаў паданне пра храм, што праваліўся і пра падземны гул на гэтым месцы. [37, с. 105–108].

У тыя ж гады з мэтай збірання мясцовых гістарычных помнікаў пачыналі ствараццa навуковыя царкоўна-гістарычныя ўстановы, старажытнасховішчы і музеі. І ў гэтай справе асноўную ролю адыгрывалі выпускнікі духоўных вучэбных устаноў.

Шмат у галіне археалогіі зрабіў праваслаўны святар Леў Сямёнавіч Паеўскі (1852–1919) (фота 2). Ён скончыў духоўную школу ў г. Кобрыне, потым Літоўскую духоўную семінарыю ў г. Вільні. З 1875 г. быў святаром у Гродзенскай губерніі (Радам, Янава, Шчытнікі, Камянец-Літоўскі), а пасля настаяцелем Свята-Прэабражэнскага сабора ў г. Слоніме. З 1903 г. з'яўляўся членам Гродзенскага губернскага Статыстычнага камітэта. Трэба адзначыць, што ён удзельнічаў у працах многіх Імператарскіх Археалагічных з'ездаў, дзе выступаў з дакладамі. У 1897 г. расійскі імператар Мікалай II наведваў Брэстчыну і яму прадставілі настаяцеля Сабoрнай царквы ў г. Камянец-Літоўску святара Л. С. Паеўскага, які паведаміў аб катастрафічным стане «Белай Вежы». З гэтай размовы і пачалося выратаванне помніка. Першую смету і чарцяжы будучага праекта рэстаўрацыі рабіў менавіта Л. С. Паеўскі. На наступны год у Імператарскай Археалагічнай камісіі ён атрымаў «Дазвол» на правядзенне раскопак на Брэстчыне. Даследаваў курганы на беразе р. Лясной і каля в. Угляны Брэсцкага пав., у ваколіцах г. Камянец-Літоўскі і старажытныя святыні г. Брэста. Л. С. Паеўскі быў адзначаны шматлікімі царкоўнымі і свецкімі ўзнагародамі. [2, с. 138–139; 21, с. 1033–1035; 29; 30, с. 309–349].

Археалогіяй захапляўся настаяцель храма ў в. Сынкавічы (цяпер на тэрыторыі Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл.) Яўстафій Міхайлоўскі, ураджэнец Гродзенскай губерні. Ён праводзіў даследаванні курганоў і гарадзішчаў на Слонімшчыне (Паўлавічы, Збочна, Ніз, Талькаўшчына), вывучаў культавы камень каля в. Сакалова і інш. Даследчык таксама збіраў калекцыі старажытных рэчаў, запісваў легенды пра помнікі археалогіі, актыўна адказваў на пытанні анкет Маскоўскага Археалагічнага таварыства. У працах Віленскага аддзялення Маскоўскага папярэдняга камітэта па арганізацыі ў г. Вільні IX Археалагічнага з’езда святар надрукаваў вынікі сваіх археалагічных даследаванняў. Да праводзімых прац ён далучаў мясцовых настаўнікаў, пісараў і святароў з суседніх парафій. Актыўна ўдзельнічалі ў раскопках святары Мількановіцкай царквы Іаан Целякоўскі, Езярніцкай – Аляксандр Галаўчынскі, Парэцкай – Фёдар Савіцкі і інш. Я. Міхайлоўскі меркаваў раскопваць курганныя пахаванні каля в. Арловічы, але мясцовае насельніцтва аказала супраціў і пагражалі «бязбожнаму святару» раптоўнай смерцю [28, с. 165–186].

Вывучэннем старажытнасцей на тэрыторыі Ашмяншчыны займаўся святар з Крэва, благачынны Ашмянскага павета Віленскай губерні Дзмітрый Плаўскі. Ён апісваў Крэўскі замак. [10, s. 23–33].

Вялікую калекцыю старажытнасцей сабраў святар з в. Парэчча Мінскай губерні Пётр Мікалаевіч Гаховіч. Акрамя багатай бібліятэкі ён меў вялікую калекцыю манет (да трох тысяч штук), а таксама камянёў і руд. Значную частку сваіх збораў святар ахвяраваў Музею Мінскага царкоўна-археалагічнага камітэта. [27, с. 262].

У канцы XIX ст. многія святары ўдзельнічалі ў раскопках археолагаў. Так, М. Янчуку пры раскопках курганнага могільніка каля в. Языль (цяпер на тэрыторыі Старадарожскага р-на Мінскай вобл.) дапамагаў мясцовы святар пратаірэй Г. Пігулеўскі. Ф. В. Пакроўскаму на раскопках каля мястэчка Шумск на Віленшчыне садзейнічаў святар Уладзімір Маркевіч. Пры вывучэнні Глінскага замка і шэра-

гу іншых археалагічных помнікаў на Полаччыне К. А. Гаворскаму дапамагаў святар Шумянка. [47, с. 124; 48, с. 62].

На тэрыторыі Магілёўскай губерні пры раскопках курганных могільнікаў С. Ю. Чалоўскім прымалі ўдзел мясцовая інтэлігенцыя, у т. л. і святары. Так, у в. Кісцяні Рагачоўскага павета даследчыку дапамагаў святар Яўген Барцэвіч, у вёсках Хадуны і Стройкалы Клімавіцкага павета – святар Павел Хруцкі [13, с. XXV–LXXXVI].

Захапляліся вывучэннем старажытнасцей і іншыя святары. Напрыклад, святар Залескай царквы на тэрыторыі сучаснага Глыбоцкага р-на Віцебскай вобласці Максіміліян Памеранцаў у канцы XIX ст. у царкоўным летапісе занатоўваў паданні пра помнікі археалогіі і нават вылучыў спецыяльны раздзел пад назвай «Достопримѣчательности прихода» [46, с. 21].

Трэба адзначыць і такі важны факт, што сярод вядомых даследчыкаў археалагічных помнікаў на тэрыторыі Беларусі многія скончылі духоўныя навучальныя вышэйшыя і сярэднія ўстановы. Напрыклад, Пецярбургскую духоўную акадэмію скончылі вядомыя археолагі К. А. Гаворскі, У. З. Завітневіч, Ф. В. Пакроўскі, Д. І. Даўгяла.

Ксенафонт Антонавіч Гаворскі (1821–1871) (фота 3) пасля заканчэння Духоўнай акадэміі выкладаў царкоўную археалогію ў Полацкай духоўнай семінарыі. Ён меў званне кандыдата багаслоўя, з’яўляўся членам-карэспандэнтам Імператарскага Рускага Археалагічнага таварыства і членам Маскоўскага Археалагічнага таварыства. У пачатку 1850-х гадоў К. А. Гаворскі праводзіў раскопкі курганоў каля г. Полацка (Шпакоўшчына, Рудня, Балотаўка), каля м. Селішча на Ушаччыне, па берагах ракі Дрысы і ў іншых месцах. Ён першым на тэрыторыі Беларусі падрабязна апісваў структуру курганных насыпаў, акцэнтаваў увагу на вывучэнні ровікаў, а таксама запісваў народныя паданні пра помнікі археалогіі. [8, с. 88–103].

Уладзімір Зянонавіч Завітневіч (1853–1927) у 1878 г. скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію, пасля чаго працаваў настаўнікам

у г. Варшаве, а затым у Кіеўскай духоўнай акадэміі. У 1885–1892 гг. праводзіў археалагічныя даследаванні ў басейнах рэк Прыпяці, Дняпра і Бярэзіны Дняпроўскай. Асаблівую ўвагу надаваў вывучэнню курганных пахаванняў дрыгавічоў. [18, с. 569–603; 19, с. 279–280; 20; 24].

Фёдар Васільевіч Пакроўскі (1855–1903) (фота 4) пасля заканчэння ў 1879 г. Пецярбургскай духоўнай акадэміі працаваў выкладчыкам у Мінскім, а затым у Віленскім духоўных вучылішчах. Пазней з'яўляўся захавальнікам Віленскага музея старажытнасцей. Напярэдадні IX Археалагічнага з'езда праводзіў раскопкі курганных могільнікаў на беларуска-літоўскім паўзмежжы. Па звестках, якія паступалі ад мясцовай інтэлігенцыі, у тым ліку і ад святароў, склаў археалагічныя карты Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерній. [2; 23; 32; 33; 34, с. 166–220; 35, с. 71–171].

Дзмітрый Іванавіч Даўгяла (1868–1942) (фота 5) скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію ў 1894 г. У 1894–1897 гг. выкладаў у Віцебскай духоўнай семінарыі і мужчынскай гімназіі. Працаваў у Віцебскім архіве, з 1912 г. – старшынёй Віленскай археаграфічнай камісіі, з 1925 г. – у Інстытуце беларускай культуры ўзначальваў гістарычна-археалагічную камісію, з 1929 г. быў дырэктарам бібліятэкі Беларускай АН. З 1937 г. з'яўляўся навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН БССР. Займаўся вывучэннем біблейскай археалогіі і гісторыі. [11, с. 358–360; 12, с. 50–60].

Кіеўскую духоўную акадэмію скончыў Іван Пятровіч Тарнава-Барычэўскі (1810–1887). Даследчык вывучаў старажытнасці Беларусі і Літвы, у тым ліку сакральныя камяні, занатоўваў паданні пра помнікі археалогіі [5, с. 286–299].

Маскоўскую духоўную акадэмію, а пасля і Пецярбургскі археалагічны інстытут скончыў Міхаіл Мікалаевіч Былоў (1862–1909). Пасля заканчэння акадэміі працаваў выкладчыкам у Варонежы, Курску, Санкт-Пецярбургу, а з 1906 г. і да канца 1908 г. – дырэктарам народных вучылішчаў Мінскай губерні. Ён меў званне кандыдата

багаслоўя. З'яўляўся адным з арганізатараў і першым старшынёй Мінскага Царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта і Мінскага Царкоўна-археалагічнага музея. [39, с. 147–149].

Казанскую духоўную акадэмію ў 1901 г. скончыў Дзмітрый Васільевіч Скрынчанка (1874–1947). Пасля заканчэння акадэміі працаваў выкладчыкам у Пермскай духоўнай семінарыі, а з 1903 г. – у Мінскай духоўнай семінарыі. Ён быў адным з ініцыятараў стварэння Мінскага Царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта і Царкоўна-археалагічнага музея. У 1909 г. Імператарская Археалагічная камісія выдала камітэту «Дазвол» на раскопкі ў Тураве і на археалагічныя даследаванні ў Мінскай губерні. У Тураў выехаў Д. В. Скрынчанка з членамі камітэта. На Барыса-Глебскіх могілках яны выявілі каменны саркафаг з рэшткамі костак, залатымі ніцямі ад адзення і абследавалі Замкавую Гару. Потым Д. В. Скрынчанка склаў планы мясцовасці з мэтай будучых даследаванняў. [14, № 20, с. 263–266; № 21, с. 267–268; 40, с. 48–50].

Шмат людзей з тых, хто праявіў сябе ў галіне археалогіі, былі выпускнікамі розных духоўных семінарый.

Полацкую духоўную семінарыю ў 1847 г. скончыў Міхаіл Лаўрэнцьевіч Вяроўкін (1825–1896). З 1888 г. ён працаваў архіварыўсам Віцебскага Цэнтральнага архіва старажытных актаў і па дакументах збіраў звесткі пра помнікі археалогіі. [6, с. 187–224; 7, с. 274–275].

Літоўскую духоўную семінарыю (г. Вільна), а пазней яшчэ і гісторыка-філалагічны факультэт Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта скончыў Яўстафій Філарэтавіч Арлоўскі (1863–1913) (фота 6). У Імператарскай археалагічнай камісіі даследчык атрымаў дазвол на раскопкі ў г. Гродна і яго ваколіцах. Стары Замак яму не ўдалося вывучаць таму, што тады там гаспадарыла вайсковае ведамства, якое не дазволіла правядзенне археалагічных раскопак. У 1896 г. у прадмесці г. Гродна ён абследаваў падземныя хады, а ў 1900 г. у в. Луконіцы Слонімскага павета вывучаў старажытны жывапіс і патайнік царквы.

Я. Ф. Арлоўскі з'яўляўся членам Гродзенскага царкоўна-гісторыка-археалагічнага камітэта. [9, с. 171–180].

Слуцкую духоўную семінарыю на выдатна скончыў Аляксандр Іосіфавіч Крукоўскі (1901–1945). Пасля семінарыі ён яшчэ скончыў курсы беларусазнаўства ў г. Мінску. Даследчык абследаваў і апісваў помнікі гарадоў Турава, Мазыра і іх наваколляў. У 1926–1930 гг. ён з’яўляўся старшынёй Мазырскага акруговага краязнаўчага таварыства. Прымаў удзел у працах I і II Усебеларускіх краязнаўчых з’ездаў (1926, 1927). [25, с. 53–54; 26, с. 51–55].

Духоўную семінарыю ў г. Магілёве ў 1909 г. скончыў Канстанцін Міхайлавіч Палікарповіч (1889–1963) (фота 7), знакаміты беларускі археолаг, адзін з заснавальнікаў сучаснай навуковай археалогіі Беларусі. Пасля семінарыі ён вучыўся ў Магілёўскім педагагічным інстытуце і ў аспірантуры Інстытута беларускай культуры па спецыяльнасці «археалогія», якую скончыў у 1928 г. У 1934 г. па сукупнасці работ атрымаў званне кандыдата гістарычных навук. У 1944–1959 гг. К. М. Палікарповіч узначальваў сектар археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР. Займаўся вывучэннем каменнага веку, у асноўным, палеаліту на тэрыторыі Беларусі і Расіі. Правёў шырокія археалагічныя абследаванні басейнаў рэк Дняпра, Сажа, Бесядзі, Случы, Іпуці і інш. У 1928–1929, 1938–1939 гг. кіраваў Бердыжскай палеалітычнай экспедыцыяй, 1935–1936, 1946, 1948 гг. – Елісеевіцкай, 1947 г. – Юдзінаўскай, 1953–1955 гг. – Падлужскай экспедыцыямі. Адкрыў больш 300 археалагічных помнікаў розных гістарычных эпох у Беларусі і Расіі. [36; 45].

Як бачна з вышэй выкладзенага, праваслаўныя святары ўнеслі значны ўклад у развіццё і станаўленне археалагічнай навукі на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX стст. Некаторыя з іх самастойна праводзілі даследаванні па вывучэнні беларускіх старажытнасцей. Многія са святароў дапамагалі прафесійным археолагам у іх працы. У той час шмат хто з даследчыкаў скончылі духоўныя

ўстановы і працавалі на ніве навукі. І ўсе разам, святары і навукоўцы, рабілі агульную справу – даследаванне і вывучэнне багатай гісторыка-культурнай спадчыны на нашых землях.

## Літаратура і крыніцы

1. Алексеев, Л. В. Игнатий Кульчинский – первый исследователь белорусских древностей / Л. В. Алексеев // Древние славяне и Русь. – М., 1988. – С. 100–105.

2. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси. XVI – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск : Беларуская навука, 1996. – 206 с.

3. Бердинских, В. А. Приходское духовенство России и развитие краеведения в XIX веке / В. А. Бердинских // Вопросы истории. – М., 1998. – № 10. – С. 134–138.

4. Бобровскій, П. О. Михаилъ Кирилловичъ Бобровскій (1785–1848): ученый славистъ-оріенталистъ / П. О. Бобровскій. – СПб. : Тип. В. С. Балашева, 1889. – 136 с.

5. Боричевскій, И. П. Известія о древнихъ могилахъ, находящихся въ веденіи Главнаго управления путей сообщения и публичныхъ зданий / И. П. Боричевскій // Извѣстія Императорскаго археологическаго общества. – СПб., 1861. – Т. 3. – Вып. 4. – С. 286–299.

6. Веревкинъ, М. Записка объ археологическихъ памятникахъ Витебской губерніи / М. Веревкинъ // Труды Виленскаго отдѣленія Московскаго предварительнаго комитета по устройству въ Вильнѣ IX Археологическаго съѣзда. – Вильна, 1893. – С. 187–224.

7. Галубовіч, А. К. Выпускнікі і выкладчыкі Полацкай духоўнай семінарыі і духоўнага вучылішча / А. К. Галубовіч, А. М. Падліпскі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Полацка. – Мінск, 2002. – С. 274–275.

8. Говорскій, К. Поѣздка (14 сентября 1852 г.) изъ г. Полоцка по направленію, такъ называемой, Ольгердовой дороги. Археологическія

розысканія въ окрестностяхъ г. Полоцка / К. Говорскій // Записки Императорскаго археологическаго общества. – СПб., 1853. – Т. 5. Приложенія. – С. 88–103.

9. Госцеў, А. П. Яўстафі Арлоўскі – «чалавек навукі» і «настаўнік-чалавек», чалавек культуры / А. П. Госцеў // Гродзенскія чытанні: зб. матэр. – Гродна, 2011. – С. 171–180.

10. Дабрыян, А. Развіццё археалогіі на Гродзеншчыне ў XIX – пачатку XX стагоддзяў / А. Дабрыян // Stan badań archeologicznych na pograniczu polsko-białoruskim. – Białystok, 2006. – S. 23–33.

11. Даўгяла, Д. І. Знаходка палеолітычнае стаянкі ў Беларусі / Д. І. Даўгяла // Гістарычна-археолёгічны зборнік. – Менск, 1927. – № 1. – С. 358–360.

12. Даўгяла, Д. І. Укладаньне археолёгічнай карты Беларусі / Д. І. Даўгяла // Працы Другога Усебеларускага краязнаўчага з’езда. – Менск, 1927. – С. 50–60.

13. Дневникъ курганныхъ раскопокъ, произведеныхъ по порученію Г. Начальника Могилевской губерніи, А. С. Дембовецкаго, въ теченіи 1892 г. въ уѣздахъ Рогачевскомъ, Быховскомъ, Климовичскомъ, Чериковскомъ и Мстиславльскомъ д. ст. сов. Фурсовымъ и старшимъ чиновникомъ особыхъ порученій при Губернаторѣ С. Ю. Чоловскимъ // Памятная книжка Могилевской губерніи на 1893 годъ. – Могилевъ, 1893. – С. XXV–LXXXVI.

14. Дневникъ раскопки в мѣстечкѣ Туровѣ Мозырскаго уѣзда Минской губерніи // Минскія Епархіальныя вѣдомости. – Минскъ, 1910. – № 20. – С. 263–266; № 21. – С. 267–268.

15. Дубровскій, С. Рогволодовъ камень / С. Дубровскій // Записки Сѣверо-Западнаго отдѣла Императорскаго русскаго географическаго общества. – Вильна, 1914. – Кн. 4. – С. 213–217.

16. Дучыц, Л. У. Беларуская археалогія ў дарэвалюцыйнай перыёдыцы / Л. У. Дучыц // Весці акадэміі навук Беларусі. – Мінск, 1994. – № 3. – С. 79–84.

17. Дучыц, Л. У. Археалогія Беларусі на Імператарскіх рускіх археалагічных з’ездах / Л. У. Дучыц // Древняя история Восточной Европы: сб. науч. ст. – Минск, 2009. – С. 39–48.

18. Завитневичъ, В. З. Область Дреговичей, какъ предметъ археологическаго изслѣдованія / В. З. Завитневичъ // Труды Кіевской духовной академіи. – Кіевъ, 1886. – Т. 2. – Кн. 8. – С. 569–603.

19. Завитневичъ, В. З. Археологическія раскопки въ системе рекъ Немана и Березины // Чтенія въ историческомъ обществѣ Нестора-летописца. – М., 1888. – Кн. 2. – С. 279–280.

20. Завитневичъ, В. З. Къ вопросу о выработкѣ критерія для классификаціи кургановъ по типамъ. – Кіевъ : Тип. Г. Т. Корчакъ-Новицкаго, 1890. – 13 с.

21. Императорская археологическая комиссия (1859–1917). К 150-летию со дня основания. У истоков отечественной археологии и охраны культурного наследия. – СПб. : Дмитрий Буланин, 2009. – 1191 с.

22. Карповіч, Н. В. Саслоўна-прававое становішча праваслаўнага духавенства / Н. В. Карповіч // Актуальныя праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі (кан. 18 – пач. 20 ст. ). – Мінск, 2007. – С. 139–143.

23. Каханоўскі, Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 119 с.

24. Киселев, В. Н. Исследователь внимательный и трудолюбивый (О жизни и деятельности историка и богослова, профессора В. З. Завитневича) / В. Н. Киселев. – Минск : Издатель В. П. Ильин, 2007. – 383 с.

25. Крукоўскі, А. І. Помнікі старасьветчыны ў Мазыршчыне. Каменныя валы / А. І. Крукоўскі // Наш край. – Менск, 1926. – № 4–5. – С. 53–54.

26. Крукоўскі, А. І. Старадаўні Тураў і яго ваколіцы / А. І. Крукоўскі // Наш край. – Менск, 1926. – № 8–9. – С. 51–55.

27. Матеріалы для «Словаря библіофиловъ» // Антикваръ. Библіографическій листокъ. – 1902. – № 8. – С. 262.

28. Михайловскій, Е. Археологическіе очерки Слонимскаго уѣзда Гродненской губерніи / Е. Михайловскій // Труды Виленскаго отдѣленія Московскаго предварительнаго комитета по устройству въ Вильнѣ IX Археологическаго съѣзда. – Вильна, 1893. – С. 165–186.

29. Паевскій, Л. Изъ поѣздки въ Москву на VIII Археологическій съѣздъ и въ Троицко-Сергіевскую Лавру / Л. Паевскій. – Гродна : Тип. Губернскаго правленія, 1893. – 19 с.

30. Паевскій, Л. Городъ Брестъ-Литовскъ и его древніе храмы / Л. Паевскій // Труды Девятаго Археологическаго съѣзда въ Вильнѣ. 1893. – М., 1895. – Т. 1. – С. 309–349.

31. Панцялейка, А. Анзельм Лячыцкі / А. Панцялейка // Браслаўскія сшыткі. Гістарычны зборнік. – Браслаў, 1997. – № 2. – С. 99.

32. Покровскій, Ф. В. Археологическая карта Виленской губерніи / Ф. В. Покровскій. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1893. – 164 с.

33. Покровскій, Ф. В. Археологическая карта Гродненской губерніи / Ф. В. Покровскій. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1895. – 165 с.

34. Покровскій, Ф. В. Курганы на границѣ современной Литвы и Бѣлоруссіи / Ф. В. Покровскій // Труды Девятаго Археологическаго съѣзда въ Вильнѣ. 1893. – М., 1895. – Т. I. – С. 166–220.

35. Покровскій, Ф. В. Къ изслѣдованію бассейна Виліи въ археологическомъ отношеніи / Ф. В. Покровскій // Труды X Археологическаго съѣзда (Рига, 1896). – М., 1899. – Т. I. – С. 71–171.

36. Поликарпович, К. М. Палеолит Верхнего Поднепровья / К. М. Поликарпович. – Минск : Наука и техника, 1968. – 202 с.: ил.

37. Протоколъ 10-го засѣданія Виленскаго отдѣленія 1-го іюля 1892 г. // Труды Виленскаго отдѣленія Московскаго предварительнаго комитета по устройству IX Археологическаго съѣзда. – Вильна, 1892. – С. 105–108.

38. Пустаход, Т. С. Забытае імя ў гісторыі: М. К. Баброўскі (1785–1848) / Т. С. Пустаход // Працы гістарычнага факультэта БДУ. Навук. зб. – Мінск, 2013. – Вып. 8. – С. 95–103.

39. Скрынченко, Д. Памяти перваго предсѣдателя Минскаго Церковнаго Историко-Археологическаго Комитета / Д. Скрынченко // Минская Старина. – Минскъ, 1909. – Вып. 1. – С. 147–149.

40. Скрынченко, В. А. Верный сын православного отечества / В. А. Скрынченко, В. Б. Колмаков // Минские Епархиальные ведомости. – Минск, 2003. – № 1. – С. 48–50.

41. Соловьевичъ, Н. Выдержки изъ лѣтописи Песочанской церкви Игуменскаго уѣзда / Н. Соловьевичъ // Минскія Епархіальныя вѣдомости. – Минскъ, 1869. – № 9. – С. 263–270.

42. С-цвъ, К. Пресвятой камень / К. С-цвъ // Минскія губернскія вѣдомости. – Минскъ,1868. – № 50.

43. У складзе Кіеўскай Русі, Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай // Памяць: Івацэвіцкі раён. – Мінск, 1997. – С. 24–33.

44. Фаворский, Е. А. Православные священники – собиратели русского фольклора / Е. А. Фаворский, А. Н. Соболев, П. А. Флоренский. – М. : Гос. Респ. Центр русского фольклора, 2004. – 414 с.

45. Чубур, А. А. Константин Михайлович Поликарпович: жизнь, открытия, ученики / А. А. Чубур. – Минск : Беларуская навука, 2009. – 216 с.

46. Шарыпкін, Р. Легенды і паданні Залесскага краю / Р. Шарыпкін // Нашы карані. – Паставы, 2003. – № 8. – С. 21.

47. Щеглов, Г. Э. Археологические розыскания Ксенофонта Говорского близ Полоцка в 1852 г. / Г. Э. Щеглов // Беларуская даўніна. – Мінск, 2016. – Vol. 3. – С. 124.

48. Янчук, Н. По Минской губерніи (заметки изъ поѣздки в 1886 г.) / Н. Янчук // Труды этнографическаго отдѣла Императорскаго общества любителей естествознанія, антропологіи и этнографіи. – М., 1889. – Кн. 9. – Вып. 1. – С. 62.

49. Rechowicz, M. Kulczyński Ignacy / M. Rechowicz // Polski Słownik biograficzny. – Wrocław–Warszawa–Kraków, 1971. – T. XVI. – Z. 2. – S. 138–139.